

# ТАЯМНІЦА ПРАФЕСАРА ФІНАНСАЎ

## НЕЗВЫЧАЙНАЯ СУСТРЭЧА

— Куды гэта паляцеў наш мячык? — спыталі дзеці ў адзін голас і пачалі ўглядвацца праз зялёны плот.

Янка паправіў далонню валасы і адважна стаў перад усімі.

— Зараз я пералезу цераз плот і дастану наш мячык.

— Ты што, а можа, там злы сабака? Не хадзі! — спалохана сказала Ліза і схапіла Янку за руку.

— Ну вось, спужалася. А я нічога не баюся, — прамовіў Янка. — І сабакі там няма, бо брэху не чуваць. Ды і шыльдачкі няма. І там, напэўна, ніхто не жыве.

— Не, не, — перапыніў яго Дзімка. — Я бачыў тыдзень таму, калі позна вяртаўся з заняткаў, што ў брамку заходзіў нейкі дзядуля.

— Ды не было там ніякага дзядулі, — бадзёра сказаў Янка. — Там заўсёды ціха. А ты баязлівец, Дзімон. Напрыдумваў сабе прывідаў у змроку ды бег хутчэй дамоў, а гэта толькі цень ад кустоўя быў.

Янка зрабіў крок да плота і праз маленькую шчыліну пачаў разглядаць двор. Сярод зялёных кустоў і травы хлопчык убачыў мячык.

— Ага, — ён задаволена паглядзеў на сваіх сяброў. — Я знайшоў яго. Праз хвіліну будзем гуляць далей.

— А як ты пералезеш цераз плот? — спытала Машка.

— А лёгка. Не першы раз я так раблю, — пахваліўся Янка, хаця ў жыцці толькі аднойчы перамахнуў цераз плот, калі ездзіў да бабулі ў вёску і яго вельмі напужаў тоўсты парсюк.

Янкавы сябры яшчэ бліжэй прыціснуліся адзін да аднаго, але ў іх вачах загарэўся агеньчык цікаўнасці, калі Янка няўмела перапаўзаў загарадзь. Раптам нага зачапілася за верх драўляных дошак, і ён спрытным рухам перакуліўся цераз плот.

Янка прайшоў некалькі крокаў, падняў мячык і ўжо рушыў назад, як раптам заўважыў у акне невядомы цень. Асцярожна, амаль на кукішках, хлопчык перабег да аранжавага падаконніка, падняў галаву і стаў аглядаць пакой. На сценах віселі карціны, на прыгожым століку стаяў даволі дзіўны камп'ютар з шырокім экранам. Па маніторы бегалі літары. Янка засяродзіў увагу на надпісе, і тут перад яго вачыма праплыў нейкі выцягнуты шарык. Яго металічны корпус блішчэў у промнях сонца. Чатыры рукі віселі долу.

"Нібыта медуза, якую я бачыў на моры. Толькі металічная. Робат-медуза", — разважаў Янка, асцярожна аглядаючы незвычайную машыну.

— Янка, ты куды знік? — пачуўся спалоханы голас Лізы.

Яго адразу пачуў робат-медуза і хутка паплыў да акна, у якое пільнаваў хлопчык. Янка не паспеў схаваць голаў, як робат адчыніў сваёй рукой акно і прагудзеў: "Дапамажыце, калі ласка. Прафесар у небяспецы".

Янка не мог паварушыцца. Робат паўтарыў яшчэ раз: "Дапамажыце, калі ласка. Прафесар у небяспецы". І толькі пасля трэцяй просьбы робата Янка апрытомнеў і адказаў:

— Я зараз. Абавязкова. Толькі сяброў паклічу. Пачакай. Пачакайце, калі ласка. Ліза, Машка, Дзімон, бяжыце сюды! Я вас зараз з робатам пазнаёмлю.





Ён ускочыў з газона, падбег да брамкі і хуценька адчыніў яе. Сябры палахліва глядзелі на Янку.

— Робат? Які робат? — спыталі яны разам.

— Сапраўдны! На медузу падобны, — хутка загаманіў Янка. — Ён хоча, каб мы яму дапамаглі. Пабеглі хутчэй!

Першы крок зрабіла Ліза, а праз імгненне дзеці ўжо стаялі перад дзівоснай машынай. Янка першым парушыў маўчанне:

— Ну, расказвай. Хто такі прафесар? І чым мы можам дапамагчы?

— Яго завуць Уладзімір Васільевіч Нормін. Ён прафесар эканамічных навук, кіраваў адным з галоўных банкаў краіны, — металічным голасам прамовіў робат. — Ён шмат працаваў, каб зрабіць нашу краіну эканамічна развітай. А калі выйшаў на пенсію, то засяродзіў сваю ўвагу на фінансавай адукацыі дзяцей.

— А што здарылася з прафесарам?

— Праз тры гады пасля выхаду на пенсію ён разам са сваім лепшым сябрам, інжынерам, стварыў мяне, — адказаў робат. — Я дапамагаў пісаць цікавую камп'ютарную гульню. Яна вучыла дзяцей, як добра разумець фінансы, эканоміку, банкаўскую справу, каб прасцей было жыць у сучасным свеце.

— І атрымалася? — спытаў Дзімка.

— Так. Мы з прафесарам скончылі яе месяц таму. Яна робіць віртуальную рэальнасць. Апранаеш шлем, які падключаны да камп'ютара, — і ты ў гульні. Не трэба джойсцікаў і клавіятур.

— Ого! Як цудоўна! — захапіўся Дзімка.

— Так, а што здарылася? — сур'ёзна спытаў Янка.

— Прафесар вырашыў паспрабаваць згуляць сам. А я дапрацоўваў праграму, — мовіў робат. — Але ворагі прафесара нейкім чынам заразілі гульню вірусам. І прафесар застаўся ў палоне ў віртуальнай рэальнасці.

— А хто яго ворагі? — пацікавілася Машка. — Ён жа добры чалавек.

— Тыя, хто не жадае, каб людзі разумелі фінансы, — адказаў робат. — Тыя, хто жадае зарабляць шмат грошай і не дзяліцца імі з людзьмі. Яны дужа сквапныя і магутныя. І толькі прафесар мог змагацца з імі. Але яны захапілі яго ў палон у ягонай жа гульні.

— А чаму ты не можаш яму дапамагчы? — спыталася Ліза.

— Я робат. А карыстацца гульнёй могуць толькі людзі. Толькі яны могуць патрапіць у віртуальную рэальнасць.

Усе замаўчалі і толькі паглядалі адзін на аднаго. Янка сказаў:

— Мы павінны дапамагчы прафесару. Нас бацькі вучылі дапамагаць людзям.





— А я вам дапамагу. Буду падказваць і накіроўваць вас у гульні, — адазваўся робат.

— Вось пабачыце, мы зможам выратаваць прафесара, — працягваў Янка.

— А што скажуць нашы бацькі, калі мы не прыйдзем абедаць? — спытала Машка. — Яны будуць шукаць нас.

— Час у віртуальнай рэальнасці ідзе так, што адзін дзень у гульні роўны хвіліне ў рэчаіснасці, — адказаў робат. — Ніхто не заўважыць вашай адсутнасці.

— Я згодная. Я пайду, — адгукнулася раптоўна Ліза. — Мы павінны дапамагаць людзям у бядзе.

— Мы з вамі! — адазваліся Машка і Дзімон.

## ЗАГАДКІ ФІНАНСАВАЙ ГУЛЬНІ

Услед за робатам-медузай яны спусціліся ў скляпенне пад домам, якое служыла прафесару кабінетам і лабараторыяй. У канцы пакоя стаялі восем шэрых фатэляў з падключанымі да іх шлемамі. Каб не іншыя рэчы ў пакоі, то можна было б падумаць, што гэта мосцік касмічнага карабля.

— Ой! — спужалася Машка. — Чалавек у фатэлі.

— Гэта прафесар, — адказаў робат. — Ён у віртуальнай рэальнасці. Цела тут, на Зямлі. А яго свядомасць там — у гульні. Сядайце ў крэслы і апранайце шлемы.

Усе, акрамя Янкі, застылі на месцы. Хлопчык азірнуўся і паглядзеў на сяброў.

— Не пужайцеся. Мы разам зможам гэта зрабіць.

Некалькі секунд яны глядзелі адзін на аднаго, але потым усе сталі ў круг і склалі свае рукі ў піраміду. Затым хутка ўскочылі ў мяккія фатэлі і апранулі шлемы.

— Я буду вас накіроўваць і расказваць вам пра гульню і яе правілы, — прамовіў робат, спрытна націскаючы на клавішы камп'ютара прафесара. — Вы будзеце чуць мой голас і бачыць мяне праз планшэт.

— Але мы амаль нічога не ведаем пра фінансы і банкі, як мы будзем яе праходзіць і ратаваць прафесара? — спытала Ліза, папраўляючы свае валасы пад шлемам.

— Там будуць падказкі,— адказаў робат. — Поспехаў у гульні. На старт! Увага! Паехалі!

Робат націснуў на кнопку, і перад вачыма дзяцей у імгненне з'явіўся кароткі калідор, у канцы якога фіялетавым святлом зіхацелі фантастычныя круглыя дзверы.

Сябры паглядзелі і на сябе. Яны былі ўжо пераапранутыя ў белаблакітныя камбінезоны, утульныя цёмна-сінія боцікі, а ў вушах месцілася маленькая слухаўка з перагаворнай прыладай.

— Ого! Нібы ў фантастычным фільме! — узрадаваўся Дзімка. — Як цудоўна!

Усе пачалі гучна дзяліцца ўражаннямі, але Янка іх спыніў:

— Ну што, каманда, наперад да прыгод і перамогі!

— Так! Дапаможам прафесару! — закрычалі ўсе ў адзін голас і пабеглі да дзвярэй.

— Вы перад уваходам у гульню, — прагучаў аднекуль голас робата.

Янка выцягнуў з кішэні тонкі празрысты планшэт — голас зыходзіў адтуль. На экране быў робат-медуза.

— Першы ўзровень — гэта ўзровень пра сямейны бюджэт.

Перад сябрамі адчыніліся дзверы. Яркае святло крыху асляпіла вочы, але яны, не вагаючыся, зрабілі крок наперад.

Першым прывык да святла Дзімон і ўскрыкнуў:

— Дык гэта ж супермаркет!

У руках Янкі завібраваў планшэт, і на экране з'явіўся тэкст, які пачаў агучваць робат.

***Сямейны бюджэт*** *— гэта ўлік усіх прыбыткаў і выдаткаў сям'і за вызначаны час, напрыклад месяц альбо год.*

***Прыбыткі*** *— гэта ўсе грошы, якія сям'я зарабляе альбо атрымоўвае. Гэта зарплата, стыпендыя, пенсія, прыбыткі ад бізнесу і г.д.*

***Выдаткі*** *— гэта тое, на што мы трацім грошы. Гэта аплата паслуг, мабільнага тэлефона, праезду ў транспарце, набыццё адзення, абутку, ежы і іншае.*

*І каб сямейны бюджэт быў вялікі, трэба ўмець разумна эканоміць.*

***Эканомія*** *— гэта ашчаднае выдаткаванне сродкаў (прыбыткаў) сямейнага бюджэту.*

Сябры ўважліва слухалі робата. А той працягваў:

— Для таго каб прайсці гульню і выратаваць прафесара, вам трэба назбіраць і захаваць неабходную колькасць грошай. На першым узроўні вы зможаце іх зарабіць з дапамогай разумнай эканоміі. А зараз паглядзіце на дошку перад вамі.

На шырокім маніторы з'явіўся надпіс: "У вас у распараджэнні 100 000 рублёў. Ваша задача прайсці праз усю краму, знайсці выхад і набыць толькі самае неабходнае для сябе".

Раптам экран заміргаў і на ім з'явілася галава. Вялікая, страшэнная, лысая, са злымі вачыма і злой усмешкай. І непрыемны голас абвясціў:

— Я вірус! Вяртайцеся, пакуль цэлыя! Вы не зможаце мяне перамагчы!

— Ты памыляешся! — гучна адказаў Янка. — Мы пройдзем гульню і выратуем прафесара!

— Ха-ха-ха! Ну паспрабуйце! Вы яшчэ маленькія для такога падарожжа! Мне нават не спатрэбіцца шмат сіл, каб вас спыніць! — насміхаючыся прагаварыла галава і знікла.

Да рукі Янкі дакранулася Машка:

— Я баюся. Вірус такі страшны.

— Усё будзе добра. Мы зможам усё пераадолець! Тым больш мы будзем разам. Мы — каманда! — супакоіў яе і астатніх Янка і махнуў прызыўна рукой. — Наперад!

## СМАГА

Як толькі яны пераступілі парог гандлёвай залы, перад іх вачыма з'явіўся надпіс: "Любая бутэлька газіроўкі за 10 000 рублёў".

— Як цудоўна, — сказала Машка. — Мне вельмі захацелася піць.

— І мне таксама, — паўтарыў Дзімка. — Давайце купім хутчэй салодкай вады.

Янка паспрабаваў праглынуць сліну, але марна — яго рот быў сухі, нібы ў пустыні.

— Гэта ўсё хітрыкі віруса. Трэба ўзяць толькі самае неабходнае, каб захаваць грошы для прафесара. — Вочы Янкі пабеглі па паліцах. — Вось вялікая бутэлька мінералкі. Нам на ўсіх хопіць.

— Сапраўды, — падхапіла Ліза. — І смагу спатоліць, і каштуе аднолькава.

Янка ўзяў з паліцы бутэльку і перадаў яе Лізе. Яна зрабіла некалькі глыткоў і задаволена ўсміхнулася. Потым павярнулася да Дзімкі і Машкі і войкнула: каля ног сяброў ляжалі дзве пустыя бутэлькі з-пад каляровай салодкай газіроўкі. Дзімка і Машка прагна пілі яшчэ з дзвюх такіх жа бутэлек.



— Што вы нарабілі?! — ускрыкнула Ліза і выхапіла ў іх напоі.

— Аддай! — уголас загаманілі Машка і Дзімка. — Мы хочам піць, а яны такія смачныя, такія салодкія!

— Нам патрэбныя грошы, каб выратаваць прафесара. А вы? Салодкая вада не спатоліць смагу. А зробіць толькі горш, — павучала іх Ліза. — Хутчэй папіце мінералкі, і ўсё пройдзе.

Машка і Дзімка вінавата апусцілі галовы.

— Прабачце нас. Мы падвялі каманду, — сказаў Дзімка.

— Мы згубілі 50 000 рублёў, — падлічыў Янка, таксама напіўшыся вады. На экране планшэта гарэла гэта лічба. — Нічога, знойдзем яшчэ грошай. Але гэта будзе нам навукай. Не трэба спяшацца і траціць грошы дарма. Трэба ўсё добра абдумваць.

— Мы зразумелі, — адазваліся Машка і Дзімка.

На экране планшэта з'явіўся робат.

— Хутчэй бяжыце да выхаду, каб вірус не змог вам перашкодзіць новай поскуддзю. Ідзіце ўздоўж паліц з вадой, потым налева і да канца па прамой.

— Зразумелі, — кінуў у адказ Янка. — Пабеглі.

Сябры ўжо бачылі перад сабой жоўты колер выхаду, як недзе ззаду зарагатаў голас:

— Вы ўсё роўна прайграеце!

— Не слухайце яго, сябры, — сказаў Янка. І яны амаль адначасова выбеглі з жудаснай крамы.

***Сяргей РЫБКОЎ***

***(Працяг казкі ў наступным нумары журнала «PRO Беларусбанк»)***